**ПАВАЖАНЫЯ ВЫПУСКНІКІ!**

На экзамене па беларускай мове вам прапануецца напісаць пераказ,які дазволіць праверыць розныя бакі вашай моўнай і маўленчай падрыхтоўкі.

Для паспяховага напісання экзаменацыйнай работы вам рэкамендуецца наступны парадак дзеянняў:

уважліва праслухайце тэкст і вызначце асноўную думку;

падумайце, да якога стылю мовы і тыпу маўлення належыць;

абавязкова складзіце рабочы план пераказу;

абазначце для сябе, якія моўныя сродкі найбольш неабходныя для раскрыцця асноўнай думкі;

аднавіце ў памяці тэкст з улікам стылю, тэмы, асноўнай думкі, тыпу маўлення;

пры напісанні чарнавога варыянта памятайце пра пабудову тэксту, яго лагічнасць, дакладнасць, паслядоўнасць, пра лексічнае і сінтаксічнае багацце мовы, не скажайце факты, плаўна пераходзьце ад адной часткі да другой;

прачытайце чарнавы варыянт і падумайце, ці неабходна ўнесці дапаўненні ў змест і выкарыстаць больш удалыя моўныя сродкі, ці трэба недзе перабудаваць сказы, каб пазбегнуць беднасці і аднастайнасці канструкцый;

праверце пераказ з улікам арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў;

прыступайце да чыставога варыянта пераказу.

ПАМЯТАЙЦЕ: пераказ ацэньваецца дзвюма адзнакамі. Першая – за змест і камунікатыўныя веды; другая – за моўныя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя навыкі.

Перад экзаменам супакойцеся, не хвалюйцеся, усю ўвагу звярніце на тэкст, на эмацыянальны бок выказвання.

Не спяшайцеся ў напісанні пераказу!

Уважліва праверце свой чыставы варыянт!

ПОСПЕХУ ВАМ!!!